**А. Я. Паўлава**,
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ВЫНІКАЎ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КРЫНІЦАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МУЗЕЙНА-ТУРЫСТЫЧНАЙ СФЕРЫ

У канцы XX ст. вызначыўся міждысцыплінарны характар крыніцазнаўства ў сістэме гуманітарных навук. Крыніцазнаўства ў сучасных навуковых даследаваннях разглядаецца як асобы метад пазнання рэальнага свету праз крыніцы, якія з'яўляюцца прадуктамі мэтанакіраванай дзейнасці чалавека і з'явамі культуры. Такі падыход арыентуе на сістэмнае вывучэнне ўсёй колькасці твораў культуры.

Аснову навукова-фондавай работы і краязнаўчых даследаванняў складае вывучэнне музейных прадметаў і дакументаў, якія адначасова з'яўляюцца гістарычнымі крыніцамі і ўтрымліваюць інфармацыю аб падзеях, з'явах і асобах мінулага чалавечага грамадства. Пры распрацоўцы мер па ахове помнікаў гісторыі і культуры, а таксама стварэнні новых турыстычных маршрутаў, спецыялістам неабходна ўлічваць вопыт папярэднікаў, пазнаёміцца з якім можна падчас вывучэння дакументальных крыніц, што захоўваюцца ў архіўных установах краіны. Акрамя таго, характарыстыка крыніцазнаўчай базы з'яўляецца абавязковым кампанентам курсавых і дыпломных работ.

У сувязі з вышэй адзначаным вывучэнне крыніцазнаўства з'ўляецца фундаментам і абавязковым элементам базавага блока музеязнаўчай адукацыі, а метад крыніцазнаўства (крыніцазнаўчы аналіз і сінтэз) – даследчыцкі метад, якім павінен валодаць кожны прафесіянал-гуманітарый. Да крыніцазнаўчых дысцыплін, што ўваходзяць у вучэбныя планы падрыхтоўкі па спецыяльнасці «Музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры» (па напрамках), можна аднесці «Крыніцазнаўства», «Асновы дакументазнаўства і архівазнаўства», раздзел «Музейнае крыніцазнаўства» у курсе «Асновы навукова-фондавай і навукова-даследчай работы музеяў» і пэўныя тэмы ў курсах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Археалогія», «Геральдыка», «Нумізматыка», «Сфрагістыка», «Храналогія», «Этналогія і этнаграфія Беларусі». Вывучэнне дысцыпліны па выбару» Лацінская мова» таксама судзейнічае вывучэнню тэкстаў пісьмовых крыніц.

Мэта вывучэння дысцыпліны «Крыніцазнаўства» – засваенне студэнтамі ведаў аб крыніцах і метадах іх вывучэння, фарміраванне навыкаў, неабходных спецыялісту для работы ва ўмовах музея. У якасці галоўных задач выкладання курса можна вызначыць наступныя: пазнаеміць студэнтаў з агульнымі тэндэнцыямі развіцця корпуса крыніц па гісторыі Беларусі; паказаць спецыфіку тыпаў і відаў крыніц, якія адлюстроўваюць пэўныя кірункі дзейнасці музейных і турыстычных устаноў; судзейнічаць фарміраванню мэтаскіраванасці на практычнае ўвасабленне атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці.

Дысцыпліна «Крыніцазнаўства» адносіцца да дзяржаўнага кампанента цыкла дысцыплін спецыяльнасці. У папярэднія дзесяцігоддзі дысцыпліну «Крыніцазнаўства» выкладалі на старэйшых курсах пасля знаёмства студэнтаў з асновамі «Археалогіі», «Этнаграфіі», «Храналогіі», «Метралогіі» і іншымі як курс, абагульняючы ўсе атрыманыя раней веды праз вывучэнне разнастайных крыніц. Зараз курс чытаецца ў 2–3 семестрах з мэтай сумясціць вывучэнне крыніцазнаўства з гісторыяй Беларусі і сусветнай гісторыяй. Згодна з вучэбным планам БДУКМ, на выкладанне крыніцазнаўства адводзіцца 94 аўдыторныя гадзіны.

Да асаблівасцяў выкарыстання вынікаў навуковых даследаванняў пры выкладанні крыніцазнаўчых дысцыплін і тэм супрацоўнікамі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства можна аднесці выкарыстанне вопыта і вынікаў асабістых навуковых даследаванняў выкладчыкаў у галінах айчыннай гісторыі, архівазнаўства, археалогіі, гісторыі архітэктуры, краязнаўства, нумізматыцы, этнаграфіі і напрацовак па кафедральнай навуковай тэме «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, трансляцыя».

Згодна з закладзенай яшчэ ў 1920-я гг. Д. І. Даўгяла традыцыяй, выкладанне дысцыпліны «Крыніцазнаўства» прадугледжвае два блокі: «Тэорыя і методыка крыніцазнаўства» і «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі». Пры вывучэнні асноўных эта-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паў работы з крыніцамі асобая ўвага студэнтаў звяртаецца на эўрыстычны этап. На аснове асабістага навуковага вопыту, а таксама вопыту даследаванняў калег дацэнты І. Н. Колабава, А. М. Нароўская, А. Я. Паўлава, А. А. Трусаў паказваюць студэнтам, што часам вынік навуковых даследаванняў напрамую залежыць ад парадку вывучэння крыніц: спачатку сам даследчык вывучае крыніцы, а потым знаёміцца з публікацыямі калег на вызначаную тэму (каб не аказацца пад уплывам чужога меркавання), ці спачатку высвятляе меркаванні калег, а потым сам звяртаецца да першакрыніц.

Вынікі навуковых даследаванняў выкладчыкаў выкарыстоўваюцца і пры вывучэнні тэмы «Знешняя і ўнутраная крытыка крыніц». Тут закранаюцца такія аспекты, як вывучэнне паходжання крыніц, высвятленне іх аўтэнтычнасці, спосаб перадачы тэксту падчас публікацый крыніц. Па вопыту вывучэння архіўных дакументаў можна лёгка прадэманстраваць важнасць правільнай сістэматызацыі і класіфікацыі крыніц як для аптымізацыі навуковай дзейнасці, так і для штодзённай музейнай і краязнаўча-турыстычнай работы.

Знаёмства з корпусам крыніц па гісторыі Беларусі прадугледжваецца ў 3 семестры (2 курс). Падрабязны разгляд кожнага тыпу і віду дазваляе паказаць інфармацыйныя магчымасці асобных відаў крыніц для навуковага даследавання розных аспектаў развіцця музейнай і турыстычна-краязнаўчай сферы, а таксама пытанняў аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Вынікі асабістых напрацовак дазваляюць падчас аўдыторных заняткаў распавесці пра крыніцы, інфармацыя аб якіх не прыводзіцца ў вучэбных дапаможніках. Так, прадметам навуковага інтарэсу аўтара на працягу некалькіх гадоў з’яўляюцца адкрытыя лісты ці паштоўкі, якія ў значнай колькасці знаходзяцца ў зборах усіх тыпаў інстытутаў сацыяльнай памяці і прыватных калекцыях, на працягу больш за 100 гадоў набываюцца турыстамі ў якасці сувеніра аб вандроўках, але дагэтуль не сталі прадметам даследаванняў спецыялістаў. Між тым, паштоўкі адносяцца да вельмі інфарматыўных комплексных крыніц. На прыкладзе паштовак можна прадэманстраваць магчымасці вывучэння выяўленчых крыніц і эпісталярнага жанру, атрымання так званай ускоснай інфармацыі аб з’явах і падзеях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванне фондаў беларускіх праектных арганізацый і архіўных збораў выбітных айчынных архітэктараў (Г. У. Заборскага, В. М. Волчека, І. У. Мядзведзева, У. А. Караля і г. д.) дазволіла падрыхтаваць дакументальны матэрыял для вывучэння тэм «Графічна-выяўленчыя крыніцы» і «Асабістыя фонды як крыніцы пра жыццё і дзейнасць выбітных землякоў».

З мэтай лепшага азнаямлення будучых спецыялістаў музейна-турыстычнай сферы з магчымасцямі навуковых даследаванняў крыніц у працэсе выкладання дысцыпліны прадугледжаны практычныя заняткі ў вядучых архіўных установах краіны. Так, пры вывучэнні аўдыявізуальных крыніц студэнты наведваюць Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў у Дзяржынску, фонды якога ўтрымліваюць багаты матэрыял па гісторыі развіцця музейнай галіны, рэстаўрацыі архітэктурных аб'ектаў і адкрыцці помнікаў выбітным дзеячам і знамянальным падзеям.

У якасці прыклада паспяховага навуковага даследавання выкладчыкаў і студэнтаў кафедры можна прывесці вопыт вывучэння фонда № 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР», што захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. У 2010 г. на падчас практычных заняткаў па крыніцазнаўству для студэнтаў-музеязнаўцаў дырэктар архіва-музея Г. В. Запартыка распавяла пра гэтыя дакументы. Студэнтка С. Недабой пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры А. Я. Паўлавай падрыхтавала дыпломную работу пад назвай «Фонды Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва як крыніцы па гісторыі дзейнасці Дзяржаўнага мастацкага музея БССР». Пры напісанні дыпломнай работы і ў працэсе далейшага вывучэння архіўнага фонда навуковым кіраўніком былі атрыманы копіі заканадаўчых, распарадчых, статыстычных і спецыяльных музейных справаводчых дакументаў, якія зараз актыўна выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе пры выкладанні тэм «Вывучэнне тэксту пісьмовых крыніц», «Заканадаўчыя дакументы», «Статыстычныя крыніцы», «Спецыяльныя сістэмы справаводства: музейнае справаводства».

У працэссе працы над кафедральнай навуковай тэмай аўтарам быў даследаваны архіўны фонд № 297 «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры», што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі і налічвае 457 адзінак захавання за перыяд з 1966 па 2007 г. Гэта дакументы справаводства цэнтральных органаў і рэгіянальных аддзяленняў, дакументы Бюро прапаганды ведаў аб помніках гісторыі і культуры, даведкі пра стан помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі рэспублікі і матэрыялы пра стварэнне «Звода помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Прыгаданыя крыніцы паспяхова дэманструюцца на занятках пры вывучэнні тэм, звязаных з аналізам зместу крыніц: разбіраюцца элементы метада крыніцазнаўства, на аснове якіх даследчык робіць высновы аб ступені паўнаты і дакладнасці крыніц, іх пазнавальных магчымасцях і навуковай каштоўнасці.

Такім чынам, выкарыстанне вынікаў навуковых даследаванняў спецыялістаў у якасці прыкладаў з'яўляецца абавязковым элементам выкладання дысцыпліны «Крыніцазнаўства».

**С. А. Паўлава,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

# МАГЧЫМАСЦІ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У ФАРМІРАВАННІ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ (на прыкладзе выкладання курса «Бібліятэчны менеджмент»)

Праблема прафесійнай кампетэнтнасці сёння разглядаецца як ключавая ў працэсе забеспячэння грамадства прафесійнымі кадрамі вышэйшай кваліфікацыі. Пачатак навуковаму вывучэнню гэтай праблемы паклалі расійскія навукоўцы (В. А. Болотаў, І. А. Зімняя, Н. У. Кузьміна, А. К. Маркава), а іншыя кампетэнцыі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі і выпускнікоў даследуюць беларускія навукоўцы (А. І. Жук, О. Л. Жук, Н. Н. Кошель, А. В. Макараў, Ю. М. Галкоўская) і інш.

Аднак даследаванняў у вобласці падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйнай сферы недастаткова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ